# ГІСТОРЫЯ ДЗЯТЛАЎШЧЫНЫ Ў НАЗВАХ

**Пікта Я.А.**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Мякінькая А.В. – выкладчык*

Работа даследуе гісторыю Дзятлаўскага раёна праз аналіз паходжання тапонімаў.

Праца заснавана на аналізе і сістэматызаванні тапонімаў Дзятлаўскага раёна. Грунтуючыся на атрыманых дадзеных, адлюстраваць сацыяльна-гістарычныя працэсы на тэрыторыі Беларусі. Большая частка тапонімау адлюстроўвае асаблівасці засялення, заняткі і культуру дадзенага рэгіёна

Мэта працы: сабраць і вывучыць тапонімы Дзятлаўскага раёна, даказаць, што яны адлюстроўваюць геаграфічныя і гістарычныя асаблівасці засялення і развіцця нашага краю.

Задачы:Сістэматызаваць тапонімы Дзятлаўскага раёна па тыпах;

Сістэматызаваць тапонімы Дзятлаўскага раёна па паходжанні;

Сістэматызаваць тапонімы Дзятлаўскага раёна па культурна-гістарычнаму пласту.

Метады даследвання: этымалагічны, міфалагічны, навуковы.

Таблица 1 – Класіфікацыя тапонімаў па паходжанні [1].

| | |
|---|---|
| Патронімы | назвы, якія паходзяць ад імёнаў, прозвішчаў, мянушак людзей – «бацькоў», заснавальнікаў сёл, вёсак ці іх гаспадароў). |
| Метафары | назвы, якія ўяўляюць сабой параўнанні. |
| Этнонімы | назвы, якія ўтвараюцца ад найменняў народаў, плямёнаў. |
| Апеляцывы | назвы, якія ўтварыліся ад намінальных слоў, якія ўказвалі калісьці на характар аб’екта. |
| Мемарыяльныя назвы | у іх афіцыйна ўвекавечаны гістарычныя асобы. |
| Дземінуцівы | назвы, якія ўяўляюць сабой памяншальную форму назоўнікаў. |
| Сімвалічныя назвы | назвы, якія адлюстроўваюць сацыяльныя і гістарычныя ідэалы. |
| Матронімы | назвы, якія ўтвараюцца ад імя маці,прозвішча,мянушкі маці. |

У рабоце прааналізаваны і былі сістэматызаваны тапонімы Дзятлаўскага раёна ў класіфікацыі, прадстаўленай у табліцы 1.

Такім чынам, усю працу магчыма звесці да некалькіх асноўных палажэнняў:

1. Геаграфічныя назвы адлюстроўваюць гісторыю дзяржавы, мудрасць народа, яго паэтычнае мысленне.
2. Геаграфічныя назвы цесна звязаны з грамадскім жыццём і мовай народаў, якія насяляюць тую ці іншую мясцовасць
3. Тапаніміка Дзятлаўскага раёна ўключае ў сябе як рускія (славянскія) назвы, так і балцкія, польскія назвы, што сведчыць аб засяленні спрадвеку нашага раёна.
4. Тапонімы Дзятлаўскага раёна адлюстроўваюць шматвекавую гісторыю краю.

***Спіс літаратурных крыніц:***

*1. Гродзеншчына: Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў пад рэд. А.М. Ненадаўца. – Мн.: Беларусь, 1999. - 398с.*

*2. Дучыца Л.У. Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў / Л.У. Дучыца– Мн.: Акадэмія Навук Беларусі, 1993. – 59с.*

*3. Лыч Л.М. Назвы зямлі беларускай / Л.М. Лыч. – Мн.: Універсітэцкае, 1994. – 128с.*

*4. Мурзаеў Э.М. Геаграфія ў назвах / Э.М. Мурзаеў. – Мн.: Наука, 1979. – 273с.*

*5. Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Дзятлаўскага р-на – Мн.: Універсітэцкае, 1997. – 398с.*

*6. Рапановіч Я.Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Гродзенскай вобласці / Я.Н.Рапановіч. – Мн.: Асвета, 1982. – 114с.*

*7. Русаў П.А. Перадумовы ўзнікнення Дзятлава і яго назвы / П.А.Русаў. – Мн.:Сер. Гуманітарных навук, 1995. – 187с.*

*8. Русаў П.А. Спатканыя ў дарозе/ П.А.Русаў. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 115с.*

*9. Суперанская Л.Н. Што такое тапаніміка / Л.М. Суперанская. – Мн.: Наука, 1978. – 320с.*